# ЗАКАЗНІК «СЭРВАЧ» — ТЭРЫТОРЫЯ, ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК

BirdLife IBA ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



Балотная сава
*Asio flammeus* (Pont.)
Болотная сова
Фатограф: Віктар Казлоўскі



Балотны лунь
*Circus aeruginosus* (L.)
Болотный лунь
Фатограф: Таццяна Раманава



Чапля-бугай
*Botaurus stellaris* (L.)
Большая выпь
Фатограф: Lars Halkjaer



Звычайны чаромашнік
*Carpodacus erythrinus* (Pall.)
(*Erythrina erythrina* Pall.)
Обыкновенная чечевица
Фатограф: Віктар Казлоўскі



Вяртлявая чаротаўка
*Acrocephalus paludicola* (Vieill.)
Вертлявая камышевка
Фатограф: Сяргей Зуёнак



Бакас
*Gallinago gallinago* (L.)
Бекас
Фатограф: Мікалай Варабей



Вадзяны пастушок
*Rallus aquaticus* L.
Пастушок
Фатограф: Дзмітрый Якубовіч



Звычайны пагоніч
*Porzana porzana* (L.)
Обыкновенный погоныш
Фатограф: Дзмітрый Якубовіч



Дубальт
*Gallinago media* (Lath.)
Дупель
Фатограф: Васілій Фядосенка



Вялікі кулён
*Numenius arquata* (L.)
Большой кроншнеп
Фатограф: Susanne Jepsen

● Чырвонай кропкай пазначыны віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Аўтар фота, што з'яўляецца фонам плаката — Вольга Лукшыц.

**Далучайцеся да руху захавальнікаў ТВП «Сэрвач» і зрабіце свой унёсак у яе захаванне!**
**Захавальнікі ТВП — актыўныя аматары прыроды, якія маюць магчымасць наведваць тэрыторыю і кантраляваць яе стан, а таксама ўдзельнічаць у прыродаахоўных мерапрыемствах.**
**Больш інфармацыі пра дзейнасць захавальнікаў ТВП «Сэрвач» можна атрымаць у сакратарыяце АПБ: (017) 263-06-13; факс (017) 265-08-11; e-mail: info@ptushki.org**

BirdLife INTERNATIONAL
norden Nordic Council
2010 Міжнародны год біяразнастайнасці
Дадзенае выданне падрыхтавана пры падтрымцы фонда **Nordic Council of Ministers**

# ЗАКАЗНІК «СЭРВАЧ» — ТЭРЫТОРЫЯ, ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК

Рэспубліканскі гідралагічны заказнік «Сэрвач» размешчаны на тэрыторыі Докшыцкага і Глыбоцкага раёнаў Віцебскай вобласці. Возера Сэрвач і частка поймы аднайменнай ракі знаходзяцца пад аховай з 1997 года, а плошча заказніка складае 9068 га.

Паўднёва-заходняя частка возера вельмі забалочана, з яе выцякае рака Сэрвач, з шырокай поймай (12,5 кіламетры), якая ўяўляе сабой нізіннае асаковае балота. Сустракаюцца таксама адкрытыя і моцна зарослыя хмызнякамі ўчасткі. У некаторых месцах нізіннае балота змяняецца пераходным. З паўночнага захаду да балотнага масіву прылягаюць хваёва-шыракаліставыя і змешаныя лясы.

Сэрвач мае статус тэрыторыі, важнай для птушак (ТВП): вялікую каштоўнасць для захавання біяразнастайнасці маюць нізінныя балоты заказніка, на якіх гняздуюцца два віды птушак, якія знаходзяцца пад пагрозай глабальнага знікнення — вяртлявая чаротаўка і дубальт. Сустракаюцца тут і іншыя рэдкія віды: чапля-бугай,  балотная сава, вялікі кулён. Шырока распаўсюджаны звычайны пагоніч, вадзяны пастушок, звычайны чаромашнік.

ТВП «Сэрвач» — крайняя паўночная кропка распаўсюджання ў Беларусі вяртлявай чаротаўкі,  адной з самых рэдкіх птушак Еўропы. У Беларусі  існуе толькі 25 месцаў, дзе сустракаецца «балотны верабей», але на іх гняздуецца да 50% сусветнай папуляцыі віда.






Тэрыторыя, важная для птушак — ТВП (Important Bird Areas — IBA) — прыродная тэрыторыя, якая мае выключную важнасць для захавання рэдкіх і знікаючых відаў птушак, а таксама для падтрымання біялагічнай разнастайнасці ўвогуле.

Праграма вызначэння тэрыторый, важных для птушак (ТВП) у Беларусі выконваецца грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ). АПБ — афіцыйны прадстаўнік міжнароднай асацыяцыі BirdLife International у Беларусі.

Калі Вы неабыякавы да лёсу роднай прыроды, маеце магчымасць наведваць тэрыторыю і кантраляваць яе стан, Вы можаце стаць адным з захавальнікаў ТВП «Сэрвач».

Каб атрымаць больш інфармацыі пра праграму ТВП і захавальнікаў ТВП «Сэрвач», звяртайцеся ў сакратарыят АПБ: (017) 263-06-13; факс (017) 265-08-11;
e-mail: info@ptushki.org

Дадзенае выданне падрыхтавана пры падтрымцы фонда **Nordic Council of Ministers**.

Фота на плакаце — вяртлявая чаротаўка. Аўтар фота: Сяргей Зуёнак.